Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłata pocztowa uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

...ь два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі ... Вільня, Віленс... Рэдакцыя ... аорача сьв...

... дастаўкай да хаты ... для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 15 Вільня, Серада 25-га трауня 1927 г. Год I

Шлях да яднаньня.

Калі толькі разыйшлася вестка аб тым, што ў сталічным месьце Заходняе Беларусі, Вільні, маюць адбыцца выбары ў новы мястовы самаўрад,—мы адразу-ж сказалі: беларускім масам Вільні па дарозе толькі з працоўнымі масамі другіх нацыянальнасьцяў, ды толькі з імі мы павінны шукаць паразуменьня і аб'яднаньня.

Мы мелі тады толькі ідэалягічныя падставы дзеля такое думкі. Мы разумелі, што наагул ня можа быць гутаркі аб супольным выступленьні на выбарах элемэнтаў працоўных, з якіх бадай выключна складаецца беларуская частка насяленьня Вільні, з элемэнтамі буржуазнымі другіх нацыянальнасьцяў. Мы няверылі ў магчымасьць узнаўленьня выбарнае „шасьнасткі" з 1922 году, бо-ж на самаўрадавых выбарах элемэнт *нацыянальны* адыходзе на другі плян і на першы плян выбіваецца элемэнт *гаспадарча-сацыяльны*.

Жыцьцё паказала, што мы не памыляліся.

Беларускія элемэнты з чыста буржуазнай ідэалёгіяй (сельсаюзьнікі і хадэкі), якіх у Вільні, як і ўсюды, зусім малая жменька,—памкнуліся на гэтых выбарах шукаць паразуменьня перадусім з жыдоўскай буржуазіяй, прасілы яе, каб падарвала ім адно мейсца на сваім сьпіску—у імя палітычных камбінацыяў. І... сустрэліся з адмовай. Тады зрабілі новую спробу паразуменьня з буржуазнымі групамі літоўскай, нямецкай і расейскай. Але і гэтая камбінацыя неўдалася. Бо-ж і ўдацца не магла; пэўне ж, ніхто ні на адзін мамэнт не сумляваўся, што за Ярэмічам, кс. Станкевічам ды беларуска-расейскім сэнатарам Багдановічам маса беларуская ў Вільні, зложаная з работнікаў ды працоўнае інтэлігэнцыі, на выбарах ня пойдзе...

Наадварот: кіненая намі думка аб „шаснастцы" не буржуазнай, *а працоўнай, работніцкай*, знайшла рэальнае выражэньне і зьдзейсьненьне ў пастаці блёку левых работніцкіх груп і партыяў — беларускіх, польскіх і жыдоўскіх. Створаны нашымі *работніцкімі дзеячамі* Беларускі Выбарны Камітэт знайшоў той супольны язык з польскімі і жыдоўскімі працоўнымі масамі Вільні, якога, ведама-ж, ня могуць мець з імі нашы буржуазныя ідэалёгі. І весь беларусы ідуць на выбары пад супольным сьцягам з *Незалежнымі Сацыялістамі, Лявіцай ППС, жыдоўскімі Сацыялістамі-Рэвалюцыянэрамі, партыяй Поалей-Цыон (лявіцай) і Прафэсіянальнымі Работніцкімі Саюзамі.*

Ня хочам сяньня займацца прароцтвамі, якія будуць *вынікі* выбарнае кампаніі гэтага блёку працоўных. Адзначаем цяпер толькі той бясспрэчны факт, што ўсялякія спробы тых ці іншых беларускіх груп дайсьці да паразуменьня ці то з польскім „лібэральным" крылом буржуазіі, ці з жыдоўскімі сіаністамі, ці з літоўскімі фашыстамі — ўсё гэта рэчы нерэальныя, і на шлях такіх паразуменьняў нашы працоўныя масы ніколі ня пойдуць. І *толькі на клясавым грунце* можа цяпер узнавіцца тая „шаснастка", якая істнавала пры выключных варунках у 1922 годзе.

Гэта нам кажа само жыцьцё.

Беларусы на выбарах у мястовую Раду Вільні.

У мінулую нядзелю, 22 мая, аканчальна ўтварыўся выбарны блёк, у які ўвайшоў Беларускі Выбарны Камітэт. Назоў гэтага Камітэту: *Работніцкі Аб'яднаны Выбарны Камітэт Сацыялістычных Партыяў і Прафэсіянальных Саюзаў.*

У склад аб'яднаньня ўвайшлі: Беларускі Выбарны Камітэт, партыя Незалежных Сацыялістаў, лявіца ППС, партыя Поалей-Цыон (лявіца), партыя жыдоўскіх С.-Р., Работніцкія Клясавыя Прафэсіянальныя Саюзы.

Цэнтральны орган блёку складаецца з шасьцёх асоб: ад Беларускага Выбарнага Камітэту—грам. Крук, ад лявіцы ППС—грам. Тарасаў, ад Незалежных Сацыялістаў—грам. Заштовт і Годвод, ад жыдоўскіх эсэраў—грам. Валт, ад Поалей-Цыон (лявіцы)—грам. Брынкельбаўм.

Сядзіба Цэнтралі знаходзіцца ў памяшчэньні прафсаюзаў—*Вялікая вул. 34.*

На паседжаньні 22 мая зроблена ўмова аб падзеле мейсц на супольным сьпіску, пры чым *беларусам забясьпечана рэальнае месца.*

Характэрная справа.

„Przegląd Wileński" апавядае нязвычайна характарную і павучальную гісторыю, якая сталася з двума прадстаўнікамі польскага суда. Перадрукоўваем гэту гісторыю дасло ўна—бяз ніякіх дадаткаў ад сябе.

„У № 1 „Дзен. Віл." с. г. зьявілася ананімная карэспандэнцыя пад загалоўкам: „Уражаньні з Наваградка", у якой аўтар пераказаў падробна (няма ведама, ці правільна?) сваю гутарку з таварышамі падарожы з Наваградка: віцэ-старшынёй Акружнога Суда ў Наваградку п. Шындлерам і судзьдзёй таго ж суда п. Ленковскім.

„Гутарка перайшла на палітычныя тэты, на палючую беларускую справу, і—паводле слоў карэспандэнта—абодва яны аказаліся гарачымі прыяцелямі беларускага руху. У карэспандэнцыі былі пададзены паміж іншым такія „страшэнныя" словы, выказаныя прадстаўнікамі польскае справядлівасьці: „Польскія паны сьмяюцца з беларускае мовы і зусім ня цікавяцца доляй беларусаў". „Польская канстытуцыя ў справе нацыянальных меншасьцяў дагэтуль істнуе толькі на паперы, бо ўлады на мясцох усімі спосабамі ўтрудняюць беларускі рух, не адчыняюць беларускіх школ"—і г. д. Карэспандэнт пры гэтай нагодзе адзначыў, што, паводле яговых ведамасьцяў, у наваградзкім судзе ёсьць балей гэткіх прыхільнікаў беларускага руху, ды што некаторыя адвакаты прымаюць у ім навет чыннае ўчасьце" (!!!).

„На карэспандэнцыю зьвярнулі ўвагу вышэйшыя судовыя ўлады, і ў выніку гэтага абодвы судзьдзі мелі дысцыплінарныя справы. Ці і як справы гэтыя былі разьвязаны, дый якія канкрэтныя закіды былі ім зроблены, — аб гэтым ня маю акуратных вестак. Быццам п. Шындлеру закідалі тое, што ён у публічнай гутарцы крытыкаваў адносіны польскага ўраду да нацыянальных патрэб беларусаў, а навет—чаму трудна паверыць!—што прыхільна гаварыў аб беларускім народзе! Як бы там ні было, у выніку неасьцярожнае гутаркі з незнаёмым падарожнікам п. Шындлер быў прымушаны выйсьці ў адстаўку"....

Што сталася з другім прыхільнікам беларусаў, газэта не падае....

Культурная праца у Вялейскім павеце.

Калі што дзеецца, дык усё к лепшаму, кажуць людзі. Забаранілі нам чытаць рэфэраты і рабіць сходы ў нашым невялічкім будынку Народнага дому, а чаму? „Zamały pokój, dla 200 czonków Hurtka, mało powietrza" (а маем толькі 154 сябры). Самі павялічваюць лік сяброў.

Дзякуй і за гэта, што апякуюцца нашым здароўем.

Забаранілі ў гэтым будынку чытаць рэфэраты, знайшлі большы, а праца ўсё-ж-такі ня спыняецца. Праўда, за гэты будынак кожны раз трэба плаціць 20 злотых, але ж гэта ўсё нічога ў параўнаньні са здароўем.

У новым будынку (пажарны ток) можа зьмясьціцца ня толькі 200, але добра і 500. У пажарных адносінах таксама бясьпечна (баяліся каб мы не згарэлі), бо ў пажарным таку гэта робіцца. Збоку стаяць бочкі в вадой і машыны.

Дык, як бачыце, усё як мае быць і здароўе захаваем і не згарым.

Дзякуючы гэтаму „wynalazku", Вялейскі Гурток Т-ва Бел. Школы ў працягу ад Вялікодных дзён, па 1-ае траўня, наладзіў 3 спэктаклі і 2 рэфэраты.

У павеце Каранішчынскім гуртком таксама на Вялікдзень быў пастаўлены спэктакль, ігралі: „Суд", „Гурток" і „Лекары і лекі". Па славам прысутнага сябры на гэтым спэктаклі гулялі добра і артысты зрабілі добрае ўражаньне на глядзельнікаў. Будуць гуляць яшчэ 22/V і 5/VI—п'есы будуць разыгрывацца: „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам" і „Апошняе спатканьне".

На першы дзень Вялікадня быў пастаўлены спэктакль у Вялейцы. Гулялі: „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам". Ня гледзячы на тое, што першы дзень Вялікадня лічыцца днём адпачынку ад перадсьвяточнай працы, глядзельнікаў сабралася даволі, гулялі добра. Былі маленькія дэфэкты, якія заўсёды знойдзе, грамадзянін, што разумее тэатральную справу, але гэта нічога. Будучыня яшчэ наша, можа і гэтыя дэфэкты скасуем.

На другі дзень Вялікадня быў адчытаны рэфэрат, ці рэфэраты на тэмы: „Янка Купала—ідэалёг адраджэньня" і „Родная мова".

Першы рэфэрат чытаў сябра Вялецкі. Рэфэрат захапіў усіх слухачоў. Было відаць агульнае зацікаўленьне славамі, што ліліся з вуснаў лектара. Вершы, якімі быў перапоўнены рэфэрат, дэклямаваліся вельмі добра. Наагул, відаць было, што аўтар добра папрацаваў над досьць труднай тэмай.

Пасьля другога рэфэрату, які быў прачытаны Уладзімірам Калядой, былі прадэклямаваны вершы, якія яшчэ больш паднялі і так бадзёрны дух, слухачоў.

Былі і тут дэфэкты, дэкляматары некаторыя ня цьвёрда зналі вершы, але ім трэба выбачаць, бо надта мала было часу на падгатоўку.

26 га красавіка вялейскімі артыстамі быў наладжаны спэктакль у в. Астравах, у 17 вярстах ад Вялейкі.

Прыехалі ў в. Астравы ўсе перамокшыя бо ішоў дождж, але ня страцілі гумару, дзеля гэтага жарты ня сходзілі з вуснаў артыстаў. Астравы—вёска невялікая; гаспадары яе прынялі артыстаў надта ветліва, як дарагіх гасьцей.

Трэба адзначыць прыкладовую гаспадарку, якую вядуць гаспадары вёскі Астравы, ня гледзячы на тое, што маюць па пяць дзесяцін зямлі.

Хаткі ўтрымліваюцца ў чыста нямецкім парадку. Чысьценька ня толькі ў хаце, але і каля хаты. У двары парадак. Усё на сваім мейсцы і наагул відаць, што гаспадары любяць працаваць—і разумна. Бо ўбольшасьці нашы сяляне працуюць праз меру, а парадку ў іх няма.

Пасьля пачастунку, які зрабілі артыстам гаспадары, распачалі спэктакль.

Ня гледзячы на дрэнную пагоду, глядзельнікаў сабралося амаль-што ня поўны ток. Адыграны былі п'есы: „Сурдут і сярмяга" і „Пасланец". Глядзельнікі асталіся надта задаволенымі, прасілі прыяжджаць яшчэ.

Наагул-жа культурная праца ў Вялейскім павеце шырыцца і захопліваець што-раз то больш сялянскую гушчу, якая хоць і перастрашаная апошнімі выпадкамі, але ізноў пачынае варушыцца і прынімаць жывы ўдзел у адраджэнскім руху Бацькаўшчыны. Не такі страшны чорт, ак яго малюць.

Сьмялей, браты-беларусы, да культурнаасьветнай працы і мы ўгледзім сьвет, які асьвеціць нас сваімі косамі і сагрэець нашы сэрцы. Мы тады ўбачым свае грамадзкае „я", угледзім, што і мы людзі, што і мы можам быць народні з іншымі культурнымі народамі.

1-га траўня ладзілі спэктакль і 2 рэфэраты ў м. Вялейцы, каб даць магчымасьць грамадзянам з вёсак пабываць на рэфэратах і на спэктаклі, пачатак прышлося зрабіць а 15 гадзіне.

Прачытаны былі такія рэфэраты: „Янка Купала — ідэалёг адраджэньня" і Роль песьняра нядолі ў справе нацыянальнага адраджэньня". Пасьля рэфэратаў былі прадэклямаваны вершы, якія спатыкаліся гучнымі воплескамі.

Слухачоў было чалавек 200, абодва рэфэраты праслухалі яны вельмі ўважна. Відаць было, што і вясковая моладзь стала цікавіцца беларускім, сваім родным словам.

Пасьля рэфэратаў пачаўся спэктакль. Білеты былі па самай маленькай цане 50 і 25 грошы. Глядзельнікаў была поўная саля.

Аркестр дружна падтрымліваў сьвяточны настрой, пануючы ў гэты дзень сярод грамадзянства. Згуляны былі: „Ня розумам сьцяміў, а сэрцам", і „Гурток".

Пасьля кожнага акту артыстаў віталі воплескамі. П'еса перасыпаецца ўвесь час сьпевамі, а асабліва 3 акт, які амаль-што не з адных сьпеваў, якія выконываліся артыстамі зусім добра. П'еса канчаецца Лявоніхай.

П'еса „Гурток" надта рассьмяшыла прысутных.

Сапсавала настрой паліцыя, якая забараніла скокі, ня гледзячы на тое, што дазвол на скокі быў ад Старасты. Але гэта нездаволеньне зьмяншыла добрае ўражаньне, што засталося ад спэклаклю і ўсе разыйшліся з надзеяй на лепшую будучыну.

Вялейчанін.

Канфлікт ССРР з Англіяй.

Пратэст радавага ўраду.

Радавы ўрад падаў англійскаму прадстаўніку ў Маскве ноту, у якой востра пратэстуе проці гвалтаў над яго прадстаўніцтвам, якія нарушылі гэтым абразьліва трактат, падпісаны ў 1921 г. Нота кажа, што ССРР залішне доўга ўжо знасіў правакацыі англійскіх міністраў, але цяпер павінен зьвярнуцца да англійскага ўраду з запытаньнем: ці ён жадае далейшага разьвіцьця гаспадарчых зносінаў з ССРР, ці наадварот—хоча ім перашкаджаць? ССРР трэбуе яснага адказу і перапросінаў за грубае нарушэньне трактату.

Англійска-радавыя адносіны.

Англійскі ўрад дагэтуль не апрацаваў яшчэ адказнай ноты на пратэст радавага ўраду ў справе вобыскаў у яго ўстановах у Лёндане. Англійскія газэты пішуць, што англійскі ўрад не спадзяецца зрыву адносінаў з боку Радаў. З другога боку, радавая прэса не прадбачыць такога кроку з боку англійскага ўраду: залішне карыснымі для абедзьвюх старонаў зьяўляюцца ўзаемныя гарговыя зносіны. Эўрапэйская прэса сцьвярджае аднак жа, што ў лоне англійскага ўраду ідзе барацьба староньнікаў разрыву з больш асьцярожнымі працїўнікамі гэтага рашучага кроку.

20 траўня ў англійскім парляманьце павадыр работніцкай партыі Гэндэрсон запытаўся ў ураду, калі будуць прадстаўлены парляманту ўсе даныя аб вобысках у радавых установах? Мін. унутраных спраў адказаў, што пакуль-што ня можа гэтага зрабіць, бо толькі яшчэ разьбірае масу захопленага пры вобысках матэр'ялу. Спадзяецца, аднак-жа, што да 24 траўня здолее зрабіць падробную справаздачу аб усім. Тады — па прапазіцыі Партыі Працы—парлямант назначыў на 26 траўня дыскусію ў справе вобыскаў, якая, трэба думаць, абернецца ў разгляд англійска-радавых адносінаў наагул.

У Аркосе пасьля разгрому.

Памяшчэньне лёнданскага Аркоса (радавы каапэратыў з радам іншых установаў у тым-жа гмаху) ўжо звольнена 18 траўня ад паліцэйскай акупацыі. Да агляду месца пагрому былі дапушчаны журналісты.

Больш за ўсё зруйнаваны склепы, дзе былі зламаны вялізарныя сталёвыя скрыні,

умураваныя ў сьцены. Зламаны сталёвыя скрыні (сайфы) і ў габінэце старшыні тарговай дэлегацыі, а таксама і ў пакоі сябры тарговага прадстаўніцтва, якія пэўна-ж мелі „загарантаваную нятыкальнасьць“... У адным пакоі знойдзена быццам аружжа. Служачыя Аркоса выясьняюць, што яны ня толькі мелі права, але і былі — па службе — абавязаны паліць шыфраваную перапіску — на выпадак равізіі, каб захапіць гандлёвую тайну ўстановы. Дзеля таго шмат папераў было спалена перад вобыскам.

Заступнік старшыні тарговай дэлегацыі перакананы, што разрыў гандлёвых адносінаў неабходны, бо прадаўжаць працу далей немагчыма—пасьля такога пагрому...

Крутаніна з дакумэнтамі знойдзенымі ў „Arcosie“ ў Лёндане.

Нядаўна газэты падалі весткі, што ў часе вобыску ў „Аркосе“ ў Лёндане (Аркос Таварыства для гандлю між Радавым Саюзам і Англіяй), знойдзены дакумэнты, кампрамітуючыя Радавы Саюз. Пісалася аб тым навет, што англійска ўлада пастараецца выдаць гэтыя дакумэнты асобнай, так-званай „Белай Кнігай“, каб паказаць такім чынам усяму сьвету, якую шкодную работу вядзе Радавы Саюз на тэрыторыі тых дзяржаваў, з якімі мае ўжо тую ці іншую сувязь. Але, нешта надта доўга цягнецца справа гэтых дакумэнтаў і навет ці ня йдзе англійская ўлада на папятную з сваім праектам надрукаваць гэтыя дакумэнты ў асобнай кнізе.... бо нядаўна выплыла з Лёндану такая вестка, што быццам дакумэнты гэтыя таксама датычаць Італіі і што таму справа надрукаваньня гэтых дакумэнтаў будзе залежыць ад таго, ці Італія, як зацікаўленая, згодзіцца на гэта. Ці сапраўды дакумэнты гэтыя датычаць і Італіі, ніхто ня ведае, апрача тых, у чыіх руках знаходзяцца гэтыя дакумэнты. Але тут мусіць расходзіцца не аб Італію, а аб тое, што мусіць весткі аб выкрыцьці кампрамітуючых Радавы Саюз дакумэнтаў, якія нарабілі столькі шуму на цэлы сьвет, ня маюць пад сабой жадные падставы.... Дык трэба жісьці на папятную....

Сэнсацыйная вестка.

Карэспанд. „Кур. Варш.“ даведаўся з пэўных крыніцаў, быццам вобыскі ў радавым прадстаўніцтве ў Лёндане выкліканы паказаньнямі аднаго англійскага марскога афіцэра, які быў арыштаваны па падазрэньню ў шпіёнстве, ды прызнаўся, што прадаў рад найважнейшых дакумэнтаў урадоўцу радавага прадстаўніцтва... — Ці не падрыхтавана ўсё гэта ўмысна, каб выклікаць канфлікт?!.

Падрыхтоўка радавага ўраду да гандлёвага байкоту Англіі.

У адказ на пагрозу англійскай прэсы сарваць тарговыя зносіны з Радамі радавы ўрад загадаў сваім гандлёвым прадстаўнікам за граніцай прыпыніць ды пераглядзець усе зробленыя заказы на замежныя тавары, зьвярнуўшыся за новымі інструкцыямі да цэнтральнага ўраду. Заказы маюць быць выдаваны надалей толькі тым краям, у якіх нармальны ход гандлёвых апэрацыяў не нарушаецца ніякімі гвалтамі. Загад яўна скіраваны проці Англіі.

Чуткі аб новым „проціpадавым фроньце“.

Францускія газэты пішуць, быццам у часе лёнданскіх размоваў Чэмбэрлен страшэнна націскаў на Брыяна, каб зрабіць рашучы проціpадавы фронт. Англійскі ўрад быццам падрыхтоўвае разрыў з Радамі, але, калі францускі ўрад ня зробіць таго-ж, тады гэта можа зьнішчыць усе „карысьці“ гэтага кроку для Англіі. Быццам Пуанкарэ зусім гатовы на крыжавы паход проці Радавай Расеі, але яшчэ таргуецца з англійскім урадам: ідзе толькі аб цану, якую Англія мае заплаціць Францыі за гэтую згоду на супольны фронт. Францыя быццам дамагаецца, каб Англія перастала падтрымліваць Нямеччыну на Рэйне. Інакш кажучы, Пуанкарэ дамагаецца ўзнаўленьня палітыкі „трыманьня Нямеччыны на зялезным ланцугу“, утрыманьня цалком акупацы, і г. д. Усё гэта хоча спрытна выкарыстаць Чэмбэрлен дзеля таго, каб адарваць Нямеччыну ад супрацоўніцтва з СССР, пагражаючы немцам „зялезным ботам“ Францыі.. Чэмбэрлен ведае, што без Нямеччыны ніякага „супольнага фронту“ проці СССР зрабіць ня можна. Але пэўна ж і Нямеччына ведае, што, калі ёй удалося так хутка вярнуць сваю адносную незалежнасьць ды самастойнасьць, дык гэта ў значнай меры дзякуючы саюзу з СССР, разарваўшы гэтую сувязь, Нямеччына змушана будзе паслушна выпаўняць усе загады Пуанкарэ ды Чэмбэрлена...

Быццам Брыян рашуча працівіцца гэтаму імкненьню Пуанкарэ, стоючы на груньце лёкарнскага паразуменьня з Нямеччынай. Якую лінію аканчальна выбярэ францускі ўрад, ад гэтага будзе залежаць увесь ход бліжэйшым падзеяў у Эўропе. Некаторыя нямецкія, навет паў-афіцыяльныя, газэты думаюць, што магчыма адмова Пуанкарэ ад палітыкі паразуменьня з Радамі, а навет—з Нямеччынай.... Тады—першым чынам—выбухне разрыў між Пуанкарэ і Брыянам, і ўрад Пуанкарэ выйдзе ў адстаўку. Хто-ж тады пераможа—з сяброў сучаснай урадавай коаліцыі: правіца ці лявіца? Лявіца мае большасьць у парляманьце, дык ясна, што сьпярша прынамся ўладу возьме апошняя: Брыян, трэба думаць, створыць новы габінэт. Які будзе яго характар: ці ён стане на груньце Лёкарно, ці рашуча пойдзе на паразуменьне з Англіяй, ня можна прадбачыць. У кожным разе, нямецкая прэса прадбачыць магчымасьць новата цясьнейшага супрацоўніцтва Францыі з Англіяй— коштам ня толькі Радаў, але і—Нямеччыны.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Вынікі выбараў ў сталіцы Польшчы.

У нядзелю, 22-га мая, адбыліся ў Варшаве выбары ў самаўрад сталічнага места Польшчы. Вынікі выбараў такія. —

Паводле кандыдацкіх сьпіскаў галасы падзяліліся гэтак:

№ 2 (ППС)—71.976 гал. — 28 мандатаў, № 4 (Бунд)—19.875 гал. — 7 ман., № 5 (Поалей-Цыон)—7.862 гал.—3 ман., № 11 (НПР)—6.294 гал.—2 ман., № 12 (нацыяналісты і клерыкалы)—118.643 гал. — 47 ман., № 16 (жыдоўскі нацыянальны блёк)—39.392 гал. — 15 ман., № 18 (жыд. раб. „Поалей Агудат Ізраэль)—5.822 гал.—2 ман., № 25 цэнтр—пілсудчыкі) - 49.673 гал.—16 мандатаў.

Камуністычны сьпісак № 10 быў уняважнены, але камуністы галасавалі ўсё-ж такі на 10. Ведама, і пададзеныя за гэты сьпісак галасы так сама ўняважнены. **Лічба ўняважненых галасоў — 66,578**, з чаго відаць, што сілы камуністаў у Варшаве блізу роўныя з сіламі ППС (апошняя дастала 71,976 галасоў).

Характэрна, што лічба ўняважненых галасоў складае **пятую частку** прызнаных важнымі.

Арыштаваньне эндэкаў за фальшаваньне выбарных сьпіскаў у Варшаве.

Правая прэса страшэнна абураецца за арыштаваньні, якія зроблены толькі-што ў Варшаве ў сувязі з фальшаваньнем выбарных сьпіскаў. Арыштаваны па даносу нейкага звольненага ўрадоўца Магістрату аж 40 асоб, з якіх затрыманы — дзеля распачатага сьледства—толькі 2.

Тое, што прадбачылася, зьдзяйсьняецца.

Абшарніцкая палітыка мін. Незабытоўскага дае плады. Яшчэ толькі нядаўна гэты міністар „афіцыяльна сьцьвярджаў“ ды з „лічбамі ў руках“, што ў Польшчы яшчэ шмат хлеба, навет значна больш, чым ей патрэба... Тады-ж у вольнай прэсе даказалі, што афіцыяльны камунікат п. міністра папросту... кажа няпраўду! І вось, цяпер праўда аб гэтай абшарніцкай палітыцы ўраду і яе рэзультаты б'юць зусім ясна ня толькі па бруху галоднага спажыўца, якога можна да часу ігнараваць, але ўжо і па дзяржаве... Вялікі ўвоз хлеба ў Польшчу ўрэшце адбіўся на ад'емным, некарысным тарговым балянсе краю.—За красавік гандлёвы недахоп дайшоў да вялізарнай лічбы 49 мільён. 659 тысяч злотых.. А яшчэ за сакавік тарговы балянс быў карысны, хаця сума вывазу ўжо на вельмі малую лічбу перавышала ўвоз. — За красавік спадак балянсу пайшоў так катастрафічна, што лічба вывазу зьменшылася на 9 міл. 305 тыс. злотых у золаце, а лічба ўвозу павялічылася аж на 19.932.000 залатых злотых. За першую чверць году ў Польшчу было ўвезена **200.000 тоннаў збожжа**, дый увоз гэты ўсьцяж расьце, глытаючы запасы цьвёрдай валюты ў краі, ды гатуючы ёй той-жа лёс, які спаткаў злоты польскі ў 1924 г...

Цікаўна, што ў сваім „камунікаце“ мін. Незабытоўскі казаў, быццам вываз збожжа ў восені быў вельмі карысны для краю (?), — бо тады збожжа прадавалася за-граніцу значна даражэй, як купляецца яно цяпер заграніцай... Гэтую сьмешную заяву, ведама, ж, няцяжка было разьбіць „у порах“, што і зроблена прэсай—з лічбамі ў руках.

Ізноў паўтараем: калі польскі ўрад за ўсялякую цану не даб'ецца пазыкі, дык злоты паляціць...

Самарэкляма.

Міністэрства Скарбу—у першыя ўгодкі маёвага перавароту — выпусьціла камунікат, у якім падлічае ўсе тыя папраўы, якія зроблены новым урадам за год яго працы. З камунікату відаць, што ў-ва ўсіх галінах гаспадарчага жыцьця Польшчы ёсьць паляпшэньне. Падаткі ідуць гладка, грашавы абарот ды банкаўскія фонды злотага—павялічыліся. Прамысловасьць разьвіваецца, безрабоцьце зьмяншаецца...

Але, нажаль, Міністэрства Скарбу падлічыла толькі сьветлыя бакі істнуючага стану ў Польшчы, а нічагусенькі не сказала аб цёмных,—як быццам іх зусім няма... Нічога ня сказана ў камунікаце ні аб грозным пагоршаньні тарговага балянсу краю, ні аб недахопе хлеба на ўнутраным рынку, ні аб узрастаючай дарагоўлі, якая ня толькі руйнуе працоўныя масы, але можа расхістаць і раўнавагу бюджэту, а ў выніку ўсяго — зваліць яшчэ ніжэй валюту...

Нічога ня сказана і аб доўга чаканай загранічнай пазыцы, якая ўжо быццам — вось-вось амаль не апынулася ў скрынях Польскага Скарбу...

Цікаўна, што адначасна тое-ж мініст. Скарбу афіцыяльна запярэчыла ўсім весткам у прэсе аб быццам узноўленых перагаворах у справе гэтай пазыкі...

Мы-ж толькі што пісалі, што, як нам выдаецца,—найлепшы мамэнт для атрыманьня пазыкі—пры дапамозе Англіі — Польшча прапусьціла: для Англіі—з паваротам на яе карысьць (пакуль-што) падзеяў у Кітаі — Польшча адразу зрабілася на 50 прац. менш патрэбнай...

Яшчэ ў справе пазыкі.

Віцэ-старшыня Польскага Банку пан Млынарскі вярнуўся з Парыжу, куды езьдзіў, як толькі што рашуча цьвярдзіла афіцыяльнае запярэчаньне ўраду, — у справах асабістых“... Але цяпер ужо ніхто ня крые, што п. Млынарскі езьдзіў разам з другім дэлегатам дзеля перагавораў у справе гэтай пазыкі. Як пішуць газэты, усе варункі ўжо аканчальна абгавораны (каторы ўжо гэта раз?), а астаноўка толькі за тым, што спорка ідзе аб „арбітра“ (судзьдзю), які б вырашаў аканчальна справу ў разе спрэчкі між польскім урадам і банкірамі ў тлумачэньні ўмовы..

Характэрны канфлікт.

Наша газэта пісала ўжо аб цікаўным канфлікце, які выбухнуў між рымска-каталіцкім „духоўным урадам“ у Польшчы і сьвецкім польскім урадам у справе „Сувязі Хрысьціянскай Моладзі“, так-зван. „У.М.С.А.“, які, ня маючы вузкага царкоўнага духу, робіць шмат добрага ў краі, карыстаючыся значнымі сумамі, якія йдуць з Амэрыкі. Лічучы гэтую разгаліненую па ўсім сьвеце „Сувязь Моладзі“ „масонскай“, сьпярша сам Папа, а пасьля каталіцкія біскупы ў Польшчы, вельмі рэзка аблаялі запраўды ж хрысьціянскую дзеяльнасьць гэтай установы, рашуча забараніўшы ўсім верным каталіком прымаць у ёй удзел. Гэткае ганьбаваньне добрадзейнай установы і забарона польскай каталіцкай моладзі прымаць у ёй якое колечы ўчасьце ператварылася ўладатку ў запраўдны палітычны скандал, бо-ж на чале арганізацыі, як яе пачэсныя павадыры, стаяць п. Прэзыдэнт Рэспублікі з жонкай, а пачэснымі сябрамі цэнтральнай управы зьяўляюцца рад міністраў на чале з самім марш. Пілсудскім...

Дык і па сутнасьці недарэчная, процікультурная адозва польскіх біскупаў, і гэты скандальны яе зварот выклікалі страшэннае абурэньне проці каталіцкага кліру, які ня тольні распараджаецца, як нейкі ўрад, у Польшчы, але яшчэ і ганьбуе сьвецкі ўрад у краі... Такога новага зухвальства „эндэцкага“ япіскапату не маглі сьцярпець кіруючыя ўладай „пілсудчыкі“. І вось, міністар Рэлігіяў і Асьветы, які толькі-што аддаў польскую школьную моладзь цалком у рукі каталіцкага кліру (загадаўшы рабіць па 3 „казённыя“ споведзі ў год!), выступіў рашуча проці „касьцельнага аўтарытэту“, які аблаяў ды забараніў „Саюз Моладзі“. 19 траўня мін. Дабруцкі ў спэцыяльным цыркуляры загадывае ўсім школьным куратарам не рабіць ніякіх перашкодаў школьнай моладзі карыстацца з усіх дабрадзействаў, якія робяць рознародныя ўстановы гэтага „Саюзу“.

„Sprawy Narodowościowe“.

(Пачатак гл. у № 14 „Нашае Праўды“).

Мы ня будзем падробна разьбіраць часопісі, хаця яна дае шмат цікаўнага матэр'ялу. Мы толькі на некалькіх прыкладах пакажам на тое, што ўся яна наскрозь прасякнута „палітыкай“, прытым, зразумела, — польскай „палітыкай“, польскай дзяржаўнасьцю, якая прадстаўляе яўную і галоўную падставу ўсіх разважаньняў „навуковых дасьледчыкаў“ Інстытуту. Мы тутака зусім ня ганім гэтай „падставы“, лічучы яе зусім зразумелай з пункту гледжаньня польскага ўраду. Ненатуральным і незразумелым мы лічым толькі праглядываючую тэндэнцыю часопісі— не прызнаваць насколькі-ж натуральнай і зразумелай тую ж падставу ўласнай дзяржаўнасьці тым народам, гвалтам адарваныя кавалкі якіх апынуліся воляй лёсу — у характары меншасьцяў у Польшчы... Гэтая „нэгрская этыка“ часам выяўляе сваё чорнае аблічча вельмі выразна скрозь „бесстароннанавуковы“, эўрапэйска белы твар часопісі...

„Нацыянальны рух народаў быў творчай сілай у часе вялікай вайны. З яго выйшаў працэс узрываньня старых дзяржаваў, абапертых на падзеле Польшчы; з яго вырасьлі таксама ўсе паваенныя дзяржаўныя новатворы. З яго ўзялі пачатак імкненьні да нацыянальнага жыцьця такіх этнічных групаў, якія данядаўна ня мелі ўласнай нацыянальнасьці, якія і далей поўнай нацыянальнай сьвядомасьці ня маюць“.—З таго ж нацыянальнага руху народаў паўсталі і „розныя спробы міжнародавага рэгуляваньня лёсу паасобных народаў, якія не здабылі сабе незалежнага дзяржаўнага істнаваньня, або якія павінны былі надалей аставацца па-за граніцамі ўласных дзяржаваў“.

Так адчыняе часопісь рэдакцыйная прадмова.

Але „Нацыянальны рух народаў быў творчай сілай“, пакуль справа йшла аб узрываньне старых дзяржаваў, падзяліўшых Польшчу... І гэты самы нацыянальны рух адразу неяк утраціў усю сваю красу ды прыемнасьць, калі ён прадаўжаецца сярод тых-жа народаў, падзеленых ды паняволеных новастворанымі дзяржавамі, калі ён пачынае „рассаджываць“ маладую Польскую дзяржаву, ствараючы ў „сучасных дзяржавах праблемы адсяродкавага (сэпаратыстычнага) руху“... І вось, побач з гэтым „рассаджаючым дзяржаву“ імкненьнем меншасьцяў,—„роўналежна, бясспынна, магутна адбываецца амаль ня стыхійны працэс асыміляцыйны, нівэляцыйны—на карысьць дзяржавы ды коштам гэтых меншасьцяў“. „Меншасьці павінны датарнавацца да патрэбаў ды вымаганьняў дзяржавы, адмаўляючыся ад сваіх імкненьняў ды надзеяў... Калі яны гэтага ня робяць, тады дзяржава, захопліваючы іх у кола свайго нівэлюючага руху, адных ламае, другіх змушае, ды з усіх так ці інакш творыць нейкае аднолькавае дзяржаўнае адзінства...

„У ва ўсіх сучасных дзяржавах Эўропы можна дагледзіць гэтыя два галоўныя імкненьні: цэнтрабежнае, рассаджаючае дзяржаву—з боку меншасьцяў, і—цэнтрацяжнае, раўнуючае—з боку дзяржавы“.

Узгодніць абодва гэтыя, выключаючыя адно другое імкненьні—у гэтым уся сутнасьць падставовага палітычнага пытаньня ў сучасных дзяржавах. Дык вось, каб аблягчыць палітыкам гэтую іх працу, навуковым дасьледчыкам трэба высьветліць аб'ектыўна „ўсё сплячэньне пытаньняў і справаў, якія павінны быць разьвязаны“—палітычна.

Шкада толькі, што, стаўляючы Польшчу ў агульны рад новастворaных пасьля вайны дзяржаваў, Рэдакцыя часопісі не паказала, што нідзе, аднак-жа, ні ў адной з іншых дзяржаваў няма такой прапорцыі меншасьцяў ды такога абшару няпольскай зямлі, як у Польшчы. Аб'ектыўна-навуковы пагляд на справы павінен перадусім адзначыць гэтую блудную ды небясьпечную будову Польшчы, як дзяржавы. Бо — ж, калі ўсе меншасьці разам з іх тэрыторыямі складаюць у Польшчы больш менш каля паловы яе насяленьня і дзяржаўнай тэрыторыі, дык, значыць, і тая „ахопліваючая, асымілюючая, яднаючая ды нівэлюючая тэндэнцыя“ дзяржавы, якую з такім смакам расьпісывае аўтар рэдакцыйнай прадмовы, мае вельмі малыя шансы ды надзеі перамагчы „тэндэнцыю адсяродкавую,— што рассаджае дзяржаву“... Дык, калі „старыя“ дзяржавы былі разбураны „творчым рухам нацыянальнасьцяў“ дзеля таго, што, маючы залішне многа паняволеных народаў, мусілі трымаць іх у послуху старымі спосабамі гвалту і насільля, — дык навуковы пагляд на тое, што робіцца ў Польшчы, павінен быў-бы сьцьвярдзіць перадусім, што тая ж прынцыповая „абмылка ў дзяржаўнай будове Польшчы“ робіць яе таксама „старой дзяржавай“, змушаючы яе карыстацца і старымі спосабамі „нівэляваньня, асыміляваньня, ламаньня“ ды кшталтаваньня на аднолькавы капыл захопленых у „дзяржаўную арбіту“ народаў...

Як ведама, дзеля таго, каб аслабіць уражаньне ад гэткай прынцыповай абмылкі дзяржаўнай будовы Польшчы, каб, наадварот, прыдаць больш „нармальны выгляд“ яе дзяржаўнаму гмаху,—польскае грамадзянства зварачала заўсёды вялікую ўвагу на статыстыку насяленьня. Як рабілася слаўная перапісь 1921 т., мы паўтараць тутака ня будзем. — Найлепшую ацэнку яе даў польскі дасьледчык ведамы п. Сроковскі, яе раскрыў усе яе фальшы і недарэчнасьці. Але гэта зусім не перашкаджае „навуковай“, „бесстароння-апалітычнай“, аб'ектыўнай часопісі, органу Інстытуту надалей карыстацца цыфрамі гэтай перапісі, пазывацца на яе — у чыста публіцыстычнай палеміцы з „Natio“... Дадамо мімаходам, што сумленьне бесстароннага і дакладнага інфарматара павінна было змусіць часопісь, кажучы аб „пэўнай памяркоўнасьці“ ў тоне „Natio“, дадаць, што першая рэдакцыя гэтага нумару першага была сканфіскавана польскім урадам...

Імкненьне неяк затушаваць тое, што робіцца для беларускага адраджэньня на Усходзе, і наадварот, вельмі далікатная „памяркоўнасьць у тоне“, калі справа йдзе аб тым, што робіцца „для меншасьцяў“ на Захадзе - таксама характэрны для бесстароннасьці часопісі.

Бачучы ў паяўленьні часопісі Інстытуту характэрную азнаку „новага курсу“ ў Польшчы, мы гатовы прызнаць у некаторых з кіраўнікоў Інстытуту і яго органу пэўную добрую волю. Але, паскольку яны бяссільны—як ідэолёгічна, таксама, трэба думаць, і матэрыяльна ўнезалежвіцца ад таго, што цяпер лічыцца ў Польшчы „дзяржаўнасьцю“, — дык ясна, што — пры ўсіх, можа ўкаго і шчырых імкненьнях да „навуковасьці“, часопісь, як і ўся праца Інстытуту, змушана і будзе мець характар перадусім—палітычны...

Ці патрэбна праўда, навуковая праўда, аб тым, што ёсьць ды робіцца ў жыцьці меншасьцяў у Польшчы, — аб гэтым хіба-ж ня можа быць спрэчкі. З вышэй сказанага дый згары ясна, што праўда — гэта наймагутнейшая сіла, якая ўсьцяж працуе **на нашу карысьць**, ды зьяўляецца нашай найвярнейшай **саюзьніцай**... Дык ня нам праўды гэтай баяцца, ці закрываць яе ад сьвету... Трэба мо' толькі дадаць, што і самая Праўда гэтая, як сказаў адзін з найбольш шляхотных расейскіх пісьменьнікаў, Міхайлоўскі, мае два аблічча, якія адно з адным цесна ды непадзельна зьвязаны: Праўда — ісьціна і Праўда—справядлівасьць. Гэта-ж і ёсьць тая вялікая ды непадзельная ў-ва ўсім, што толькі датычыць чалавечага жыцьця, Праўда.

Дык вось цяжка спадзявацца, каб новая польская **„палітычна-навуковая“** пляцоўка зразумела гэта ды стала на вышыні гэтай праўды. Ясна гэта ўжо з вышэй сказанага аб першым нумары часопісі „Справы Народовосьцёвэ“.

А што пляцоўка гэтая мае быць **ясна і выразна польскай** аб гэтым ня менш выразна сказаў сам яе старшыня п. Тугутт.

У фашыстаускай Літве.

„Чудасія, моспане“...

Толькі што ў Коўні арыштаваны, як ваенны шпіён,—былы **начальнік літоўскага генаральнага штабу**—ген. Клешчынскі.

Ген. Клешчынскі атрымліваў ад літоўскага ўраду добрую эмэрытуру, атрымаў надзел зямлі, як ваенны асаднік, і апошні час лічыўся ў асабістым распараджэньні прэзыдэнта Рэспублікі.... Арыштаваны генарал-шпіён у той час, калі ён перадаваў урадоўцу пасольства суседняй прыязнай дзяржавы пакет з важнымі дакумэнтамі.

Газэты пішуць, быццам у сувязі з арыштам адбылася гутарка між прэм. Вальдэмарасам і радавым паслом у Коўні Александраўскім.

Што ж, гэткія здарэньні зусім ня псуюць узаемных адносінаў суседніх прыязных дзяржаваў, бо ўсе гэткія выпадкі здараюцца на падставе так-званага „прынцыпу ўзаемнасьці“... — Нядаўна мы чыталі аб скандальных арыштах англійскіх шпіёнаў у Парыжу, якія цікавіліся перадусім францускай авіяцыяй. І нічога: прышлося толькі англійскаму ўраду значна даражэй плаціць сваім шпіёнам, якія слушна лічыліся дагэтуль — першымі ў сьвеце...

Англійскі банкавы націск на Літву.

Рыжская прэса апавядае, як рознымі шляхамі ды способамі націскае англійскі ўрад на Літву, каб—за ўсялякую цану — мірылася з Польшчай—у мэтах перадусім англійскай гаспадарчай да ваеннай палітыкі... Калі дыпляматычныя крокі англійскага, францускага і італьянскага паслоў і іх пагрозы не падзеялі так шпарка, як яны хацелі, англійцы пачалі „ціснуць“ праз банкі.—Англійскі ўрад загадаў усім краёвым банкам, каб спынілі ўсялякія крэдыты для Літвы. Банкі пачалі навет рваць ужо падпісаныя ўмовы. Так, напрыклад, з прычыны спыненьня крэдыту адным з банкам, спынілася ўся праца па будаваньню навараспачатых чыгункавых шляхоў...

Ня кіём, дык палкай, але—рабі, уража, як пан кажа...

Гэткім чынам міністэрства Рэлігіяў і Асьветы выразна скасавала сваей сьвецкай уладай загад аб байкоце ўсіх установаў „масонскага саюзу“, выданы духоўнай уладай Рымскага Касьцёла з пачыну самога Папы. Цікаўна, як гэтае змаганьне „двух мячоў“ — духоўнага і сьвецкага—адаб'ецца ў школе?!

Звальненьне ген. Развадоўскага.

З віленскай Антакольскай вайсковай турмы звольнены ген. Развадоўскі, якога марш. Пілсудскі пратрымаў роўна год пад арыштам. Генарала, як мы інфармавалі, вывезьлі ў Варшаву, дзе ён будзе адказываць на судзе з волі. За што, яшчэ дакладна нявядома!

Заграніцай.

У справе зьезду нацыянальных меншасьцяў Эўропы.

У Вене адбылася нарада прадстаўнікоў нац. меншасьцяў усіх эўрапэйскіх дзяржаваў, на якой апрацавана была праграма зьезду дэлегатаў гэтых меншасьцяў, які мае быць у Жэнэве ў жніўні гэтага году.

Сэсія Рады Лігі Народаў.

На 13 чэрвеня назначана адкрыцьце 45 сэсіі Рады Лігі Народаў, на якой будзе старшынстваваць Чэмбэрлен. На павестцы Рады—29 справаў, паміж якіх — справы разбраеньня, нямецкага паветранага флёту, і інш.

Дамаганьні радавай дэлегацыі(?)

Нямецкая прэса піша, быццам атрыманыя радавай дэлегацыяй новыя інструкцыі з Масквы загадываюць ей дамагацца, каб у агульнай рэзалюцыі Канфэрэнцыі была сцьверджана выразна ня толькі магчымасьць існаваньня камуністычнай гаспадарчай сыстэмы побач з капіталістычнай, але і пажаданьне, каб яны супрацоўнічалі разам. Быццам, у выпадку адмовы Канфэрэнцыі ўключыць гэткі пункт у рэзалюцыю, радавая дэлегацыя павінна зараз-жа пакінуць Канфэрэнцыю і вярнуцца дамоў. Быццам аканчальная постанова ў гэтай справе зроблена быць мае на апошнім агульным сабраньні Канфэрэнцыі.

Дамаганьне радавай дэлегацыі прынята споўна.

У крыху іншай форме, але, па сутнасьці, канфэрэнцыя прыняла дамаганьне радавай дэлегацыі, сцьвярдзіўшы ў рэзалюцыі, што, ня ўмешываючыся ў справы чыста палітычныя, Канфэрэнцыя лічыць вельмі карысным для будучага эканамічнага супрацоўніцтва ўсіх краёў учасьце ўсіх прысутных на Канфэрэнцыі дэлегатаў розных дзяржаваў, не зварачаючы ўвагі на тое, якая гаспадарчая сыстэма пануе ў тым ці іншым краі (гэта значыць — капіталістычная, ці сацыялістычная).

Амэрыка дае крэдыты ССРР.

Нямецкая прэса даведалася, быццам радавая дэлегацыя ў Жэнэве мела рад нарадаў з амэрыканскай дэлегацыяй—у справе пазыкі. У выніку перагавораў быццам амэрыканскія прамыслоўцы запрапанавалі Радам значныя крэдыты — на куплю амэрыканскіх тавараў.

Новая ваенная ўмова між ССРР і Турцыяй.

У адказ на замыслы Мусоліні толькі што заключана, як піша нямецкая прэса, новая ваенная ўмова між Радамі і Турцыяй. Умова паміж іншым прадбачыць дастаўку для турэцкай арміі ваенных матэрыялаў і інструктароў з ССРР.

Рэзультаты лёнданскай візыты Думэрга і Брыяна.

Венскія газэты даведаліся, быццам у Лёндане Чэмбэрлен з Брыянам аканчальна згаварыліся аб спробах супольнай барацьбы з камунізмам і з расейскімі бальшавікамі. Пры гэтым быццам Англія і Францыя пастанавілі зрабіць Нямеччыне рашучую прапазыцыю, каб тая выбрала выразна: або іх, або Рады; ніякага нэйтралітэту Нямеччыны Англія і Францыя быццам больш не дапускаюць. Калі Нямеччына далучыцца да procі-радавага саюзу, тады ей зробяць шмат уступак, паміж іншым — дазволяць павялічыць лічбу арміі, зьменшаць акупацыю і аддадуць назад Данцыгскі калідор...

Радавая прэса аб лёнданскай візыце.

„Праўда“ піша ў справе візыты францускіх дзяржаўнікаў у Лёндане, што нарады пэўна ж датычылі супольнай акцыі процi Радаў і процi Кітаю. Калі Францыя пойдзе на англійскую авантуру ды падпарадкуецца англійскай праграме, дык пэўна ўтраціць і незалежнасьць сваей палітыкі, да таго ж заплаціць усе кошты англійскай авантуры...

Нячуваны скандал у англійскім парляманьце.

У англійскім парляманьце—у часе дыскусіі над законам процi забастовак і наагул работніцкіх арганізацыяў—здарыўся нячуваны скандал. Як ведама, работніцкая апазіцыя заявіла, што ў часе трэцяга чытаньня праекту ўнясе больш за 300 папраўак. Гэта-ж, зразумела,—тактыка абструкцыі. Гэткім чынам прыняцьце законапраекту Палатамі зацягнулася-б надоўга. Тады выступіў сам прэм. Балдвін, які заявіў, што ўрад трэбуе абмяжаваньня дыскусіі, бо, калі-б адчыніць вольную дыскусію па ўсім папраўкам апазіцыі, тады першая стацьця закону была-б прынята толькі — у верасьні месяцы. Процi прапазіцыі прэм'ера выступіў адзін з павадыроў работнікаў Кляйнс, які заявіў, што дамаганьне ўраду—нячуванае абмяжаваньне правоў палаты і апазіцыі, дадаўшы, што прыняцьце прапазіцыі ўраду змусіць усю апазіцыю—пакінуць салю парляманту, „Але, дадаў ён, мы кідаем парлямант, каб вярнуцца ў яго ў хуткім часе—ужо як большасьць, якая здолее тады разрахавацца з ворагамі работніцкай клясы.

Урадавая большасьць з сьмехам слухала гэтыя пагрозы і прыняла прапазіцыю свайго прэм'ера 259 галасамі процi 13 лібэралаў.

Тады ўсе работніцкія паслы вышлі з салі.

Пасьля таго адбылося некалькі нарадаў работніцкіх групаў паслоў, на якіх пастаноўлена ня прымаць учасьця ў працы парляманту, пакуль большасьць ня возьме назад сваей крыўднай пастановы.

Зьмяншэньне акупацыйнай арміі.

Ня гледзячы на рашучыя адмовы Брыяна і Чэмбэрлена, нямецкая прэса пераканана, што — у сувязі з перагаворамі абодвух міністраў у Лёндане ў часе візыты прэзыдэнта — акупацыйная армія будзе зьменшана на 10 тыс. чалавек.

Францускія газэты пішуць, быццам Чмэбэрлен з Брыянам зусім не абгаварывалі справы зьмяншэньня акупацыйных арміяў у Нямеччыне. Але... калі Нямечча выпаўніць усе дамаганьні Францыі ў справе збурэньня крэпасьцяў на ўсходзе, тады, само сабой, пасьля сцьвярджэньня гэтага збурэньня, акупацыя мае быць зьменшана... Як ведама, толькі што Брыян і Чэмбэрлен заявілі, што акупацыя ня мае быць зьменшана. А немцы заявілі, што пасьля скончэньня бурэньня ўкрапленьняў, на якое яны згадзіліся самі на Парыжскай нарадзе, яны афіцыяльна і рашуча паставяць трэбаваньне зьмяншэньня, калі не скасаваньня акупацыі.

Гэткім чынам выходзіць, што іх дамаганьне будзе споўнена, ці — што Англія і Францыя ізноў пайлі на ўступкі.

Француская армія.

Францускі парлямант прыступіў да разгляду ўрадавага праекту аб рэарганізацыі арміі. Паводле праекту, армія будзе складацца ўсяго з 540.000 душ. Прапазыцыя камуністаў адлажыць разгляд праекту—адкінута.

Новы аўстрыйскі ўрад.

Аўстрыйская Нацыянальная Рада (Сойм) выбрала новы ўрад — з тым-жа прэм. Зэйплем на чале. Гэткім чынам, у Аўстрыі зноў уладу трымаюць „хрыстовыя дэмакраты“. Як раўнаважнік іх уплываў у дзяржаве, у сталічным самаўрадзе паўнаўладным гаспадаром зьяўляюцца сацыял дэмакраты.

Паўстаньне на Філіпінах.

На Філіпінскіх астравах, належучых да Амэрыканскіх Штатаў (ня так даўно адабраных імі ад Гішпаніі) выбухла паўстаньне. Павадыр паўстанцаў, нейкі Антрэхорадэ, абвясьціў сябе каралём Філіпінаў.

Заява мін. Чэна.

Міністар замежных спраў ханькоўскага ўраду Чэн заявіў англійскаму карэспандэнту, што дарэмна англійскі ўрад вядзе флірт з Чанг-Кай-Шэкам, — бо ён не пратрымаецца даўжэй, як да канца лета. Не пазьней, як праз 3 месяцы, Пэкін будзе ў руках радыкальнага паўдзённага ўраду, і тады аб'яднаны Кітай пачне гутарыць такой мовай, якую не пасьмее ўжо больш ігнараваць навет Англія.

ХРОНІКА.

Чэрговыя беларускія справы. 31-га траўня у м. Слоніме выязной сэсіяй Акружнога Суда будзе разглядацца справа 65 сялян, абвінавачаных з арт. 102 К. К. у прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняй Беларусі, якая мела на мэце адарваньне Заходняй часьці Беларусі і далучэньне яе да Радавае.

13 га чэрвеня ў тым-жа м. Слоніме выязной сэсіяй Акружнога Суда будзе разглядацца справа 67 сялян, абвінавачаных з арт. 102 К. К. ў прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняй Беларусі. Абвінавачаныя як з першага, так і з другога працэсу, параскіданы па вастрогах Горадзенскім, Пружанскім і Слонімскім.

Нас хочуць „ашчасьлівіць“! У сваім часе беларуская прэса паведамляла, што пры віленскай куратарыі—па загаду міністэрства асьветы — была наладжана асобная камісія дзеля апрацаваньня праграмаў беларускіх пачатковых школ. У гэную камісію ўвайшлі тры ўрадоўцы: дырэктар польскае ўрадавае гімназіі ў Вялейцы, Любіч-Маеўскі, вучыцель польскае ўрадавае настаўніцкае сэмінарыі ў Вільні, Абрамовіч, ды вучыцель польскай урадавай гімназіі ў Навагрудку, Лазінскі.

На адным з пасёджаньняў гэтае камісіі—на падставе запросінаў віленскага куратара — прадстаўнікі беларускага грамадзянства паставілі рад сваіх дамаганьняў у адносінах да праектаваных урадавых беларускіх школ. Паміж гэтымі дамаганьнямі было і тое, каб навука беларускіх прадметаў і ўсе кніжкі друкаваліся **гражданкай**, а не лацінікай, як таго дамагаліся ўсе палякі, спадзяючыся праз лацініку хутчэй спольшчыць беларусаў. Падтрымаў у гэтым палякоў толькі адзін беларус — кс. Адам Станкевіч, які рашуча высказаўся за лацініку. І вось, як паведамляюць „Родныя Гоні“, камісія, прыняўшы рад дамаганьняў беларускіх культурных дзеячоў адносна да падзелу гадзін беларускіх і польскіх прадметаў, у падставовым пытаньні аб тэй ці іншай азбуцы, высказалася, як і кс. Станкевіч, **за лацініку. Гэтая „апінія“** камісіі пашла на зацьверджаньне ў міністэрства асьветы. Як гляне на справу апошняе,—хіба-ж няма ніякага сумліву!

Беларускае арганізованае грамадзянства павінна з свайго боку рашуча выступіць перад міністэрствам процi такога вырашэньня беларускага агульна-нацыянальнага пытаньня—на падставе „апініі“ камісіі і хадэцкае партыі, якая прадстаўляе зусім маленечкую частку нашага грамадзянства. Мы ня можам дапусьціць, каб польскім урадам быў учынены гэткі гвалт над адвечнымі нашымі нацыянальнымі традыцыямі і воляй жывога народу!

Асаблівы „прадстаўнік“ беларусаў. Ведамы „полёнофіл“, сябра хадэцка-сельсаюзьніцкага „Інстытуту Беларускае Гаспадаркі і Культуры“, пан Дубейковскі, выбарным камісарам назначаны за сябру Галоўнага Выбарнага Камітэту, як „прадстаўнік“ беларусаў. Мусім адзначыць, што, нажаль, пан Дубейковскі „прадстаўляе“ хіба толькі зусім маленечкую частку віленскага беларускага грамадзянства, якая, здаецца, навет ня будзе прымаць чыннага ўчасьця ў выбарнай кампаніі. Дык можна наперад сказаць, як гэны „прадстаўнік“ будзе бараніць у Камітэце беларускія інтарэсы!

Польская прэса адзначае са слоў выбарнага камісара, п. Лучыньскага, што ў Галоўным Выбарным Камітэце ўсе справы дагэтуль вырашыліся аднагалосна. Трэба думаць, што гэтае ідэальнае згоды пан Дубейковскі не папсуе....

Літоўскія фашысты—па слядох „нашых“ хадэкаў. Орган літоўскіх фашыстаў у Вільні „Życie Ludu“ ў № 9 з мінулае нядзелі робіць ілжывы данос польскім уладам на нашу часопісь, быццам яна зьяўляецца „грамадаўскім органам“. Гэта—і ілжа, і адначасна паскудны данос, бо-ж ведама, што „Грамада“ польскім урадам зьліквідавана, а тым, хто бы вёў далей яе работу, улада пагражае суровымі рэпрэсіямі.

Цікаўна было-б усё-ж такі выясьніць: ці падобны мэтад літоўскія фашысты запазычылі ад беларускіх хадэкаў і сельсаюзьнікаў, ці—наадварот—апошнія пераняли яго ад літоўскіх фашыстаў?!

Характэрна так-жа заява рэдакцыі літоўскае газэты, быццам грам. Ластоўскага літоўскі фашыстаўкі ўрад выкінуў з Літвы за тое, што ён... „у ўласнай сям'і наўмысьля з'арганізаваў камуністычную ячэйку“! Як бачым, ня толькі на грунце Заходняе Беларусі ўтварыўся звычай усіх няпрыемных беларускіх дзеячоў хрысьціць у „камуністы“: пераняла яго і фашыстаўская ўлада ў Літве.

Вясьці далей якую-колечы палеміку з літоўскім фашыстаўскім органам лічым бязмэтным: нашага пагляду на фашызм—ці то італьянскі, ці польскі, ці літоўскі мы ўсё-роўна ня зьменім!

Водгукі разгрому Грамады. Б. сэкр. Лідзкага Пав. Кам. грам. Шамкевіч Кастусь пад залогам 700 зл. звольнены з Лідзкага вастрогу, дзе прасядзеў каля 4-ох месяцаў. Арыштаваны ён быў у слаўную ночку з 14 на 15 студня с. г. Чуецца ён на здароўі вельмі кепска, бо арганізм яго—і без вастрогу сьвідравалі сухоты.

„Суботнік“ у Віленскай Беларускай Гімназіі. 14-га траўня ў салі Беларускае Гімназіі адбыўся суботнік. Пастаўлена была камэдыя ў 2-х актах Якаўлеўскага ў перакладзе на беларускую мову „Жаночая цікавасьць“, якая была згуляна добра, асабліва падабалася публіцы навьтараная гульня ўталентаванага артыста грам. А. Міхалевіча. Хор пад кіраўніцтвам грам. Шырмы зрабіў вялікае ўражаньне. Шкада, што беларусы ў Вільні ня маюць сталага тэатру. Шмат публікі і зацікаўленасьць на апошняй вечарыне лішні раз даводзяць, як ён патрэбны.

Афіцыяльны курс грошы на 24 траўня. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

24./V. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

У маі.

Як чаромушную бель
Сьцеле белы сьнег мяцель...
Так раптоўна ў сьветлы май
Сыпнуў белы цьветабой!
Так і ў жыцьці часта вось
Нібы мэта ужо ёсьць...
Раптам грозны, буйны вал
Разаб'е ўсё, як ад скал.

1927. **Хв. Ільляшэвіч.**

Няма вясны.

Ў грудзёх зацьвіў прыгожы май,
Ў грудзёх жыве вясна,
Але калі-ж убачу я,
Цьвітучым родны край?

Прыйшла вясна, ды не для вас...
Зімовы чуцен дух.
Ня час яшчэ вясны, ня час...
Зьвініць яшчэ ланцуг.

Няма яшчэ вясны, няма —
Ня наш цьвіце то май.
Ў няволі стогне родны край:
Няма вясны, няма!

18/V. 1927 г. **Ал. Салагуб.**

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

З вышэйшай кваліфікацыяй...

Сем гадоў я думаў...
Думаў... Думаў...

І ўсё ня мог дагадацца, чаму гэта беларускім настаўнікам школы не даюць?

Чытаў я нешта ў газэтах, што ў нашых настаўнікаў кваліфікацыі замалыя, што вучыць нашых дзетак па заходня—культурнаму яны ня могуць і г. д.

А мо' гэта і праўда, хто-ж яго ведае.— Ведама-ж мы, беларусы, людзі цёмныя; куды-ж нам!...

Але якія-ж тут трэба вышэйшыя кваліфікацыі?—вось пытаньне.

Сем гадоў ламаў я над гэтым галаву і ніяк сам дадумацца ня мог, аж тут раптам разгадка сама, як з неба звалілася.

Бяру неяк у рукі „Dziennik Wileński“ за № 114,—той самы дзікі обстаўскі д[illegible]нік, які рознай брахнёй на беларусаў зай[illegible]эцца. Які нападае, як можа, на беларускіх настаўнікаў і крычыць каб школы на „Крэсах“ аддаваць толькі польскім настаўнікам з Варшавы, Пазнані, Галіцыі, бо яны з „вышэйшай кваліфікацыяй“.

Гэтым разам чытаю пра дзьвох польскіх настаўніцаў, аб „вышэйшых кваліфікацыях“ якіх няхай сьведчыць гэта хронікерская ўвага:

„— **Арыштаваньне фальшаўнічак 50 залатовых банкнотаў.** Перад некалькімі днямі ў краме пры вул. Міцкевіча № 11 затрымана жанчыну, якая за купленыя тавары, хацела заплаціць фальшывым банкнотам, вартасьці 50 злотых. Затрыманая ў III камісарыяце назвалася настаўніцай з Віленска-Троцкага павету Аўгеньней *Блёндынувнай*, пражываючай ў сястры сваей гэтак сама настаўніцы ў вёсцы Асеньнікі. Дзеля пэўнасьці затрымануя адаслана да Сьледчага ўраду. Па дарозе арыштаваная хацела незаметна зьнішчыць легітымацыю, выданую школьным куратарыўмам на прозьвішча настаўніцы *Бодэньскай*. Пастарункову перашкодзіў зьдзейсьніць яе намер. У сьледчым урадзе выясьнілася, што легітымацыя падроблена тушам.

Спэцыяльны ўрадовец, які паехаў да Асеньнікаў не знайшоў там сястры затрыманай, дзеля таго, што яна жыла ў вёсцы Шпаркоўшчына. Там, у няпрысутнасьці яе была зроблена рэвізыя. Вынікі гэтай рэвізыі вельмі цяжкія: Знайдзена кальку, на якой было вырысавана контуры банкноту, фальшывае пасьведчаньне аб скончэньні гімназіі, легітымацыю на прозьвішча настаўніцы Вікторыі Латыво-Латыцкай, а таксама акадэміцкую легітымацыю львоўскай студэнткі,—Міны Жвардон.

На другі дзень на вагзале ў Вільні арыштавалі сястру *Блёндынувны* — Валерыю. У часе дапросу прызналася яна, што праўдзівае яе прозьвішча *Радванувна*. Гэтак сама выясьнілася, што была яна настаўніцай дзякуючы таму, што ў 1924 г. падала ў кураторыум фальшывыя дакуманты. Уся гэта справа тоне ў моры прозьвішчаў, выдумляных спрытнымі ашуканкамі. Аднак, сьледзтва ведзенае адным з спрыйнейшых сышчыкаў пад дазорам камісара Дістэргоффа выясьніць цёмныя старонкі гэтай афэры і паможа выявіць—безсумліўных супольнікаў. Абедзьве сёстры адзначаюцца вялікай мерай самапэўнасьці і стараюцца ня быць прыгнечанымі лёсам, які іх чакае. Абедзьве паходзяць з Львова“.

Аж валасы са страху дубам устаюць.

Падумаць трэба! Тры гады гэтыя настаўніцы вучылі нашых дзетак. Разам з імі

„Nie rzućmy ziemi“ пяялі, *„łowickie wycinanki“* з паперы выразалі, трэцьцямайскія ўрачыстасьці ладзілі і іншыя высокакультурныя рэчы тварылі.

Прышчапляюць гэтыя настаўніцы нашым дзеткам заходня-эўрапэйскую культуру, а віленскае куратарыум і рады сабе:

— Настаўніцы не абы якія, ня тутэйшыя... ажно з Галіцыі, з самага Львова! і пабеларуску ані ў зуб;—адным словам пацеха для „Крэсаў“, дый толькі! А кваліфікацыі!—абыйдзі ўвесь сьвет,—лепшых ня знойдзеш: і пячаткі ёсьць і апінія...

Але ведама, як чалавек з вышэйшай кваліфікацыяй, дык ня можа ён сядзець на адным месцы, — яго парывае да вышэйшай мэты, а да вышэйшых ідэалаў проста рукі сьвярбяць...

Гэтак і з гэтымі настаўніцамі. Пачулі яны, што ў Польшчы фінансавы крызіс, што ўрад за ўсякую цану за граніцай пазыкі шукае, а там грошы даюць, але і з рук ня пускаюць.—Вось і кажуць настаўніцы:

— Нашто чужакікам кланяцца, калі мы ў сваім краі столькі талентных людзей маем?! Трэба-ж памагчы скарбу! Мала ў скарбе грошай,—мы болей наробім...

Ну і пачалі рабіць! а гэтак лоўка, што як пісаў *„Exspress Wileński“*: *„kilka banków polskich padło ofiarą sprytnych oszustek“*.

Брава! панны настаўніцы, брава!

А пан куратар, мусіць, ня ведаў, што гэтакіх спрытных настаўніцаў *у лоне* свайго куратарыуму мае?!

Але вось бяда з гэтымі кваліфікацыямі! Шыла вылезла з мяшка і... стала ўсім відаць, што гэтыя паненкі настаўніцы ня толькі свае „кваліфікацыі“, але і прозьвішчы, а навет і пашпарты фальшывыя, падробленыя маюць.

Вось бяда! А пан куратар толькі цяпер аб гэтым даведаўся. Ніяк часу ня было: усё польска-беларускія канфэрэнцыі ладзіў, дзень і ноч усё аб ушчасьліўленьні беларусаў думаў:

Думаў, думаў і ніяк дадумацца ня мог, як-бы гэта спраўдзіць сапраўднасьць належных атэстатаў аб кваліфікацыі. Ведама-ж Львоў ня перад носам,—больш 600 кілёмэтр. ад Вільні, як-жа тут спраўдзіць?

У сучасным часе ўласную жонку спраўдзіць цяжка, а пра паненак са Львова і казаць няма чаго...

Кажуць, што на „страшным судзе“, калі ў пекле будуць судзіць усіх жывых і мёртвых, дык тагды грахі кожнага чалавека наверх вылезуць; дык цікава, колькі тагды выйдзе наверх грахоў усіх сучасных настаўніц і настаўнікаў з Варшавы. Пазнаня, Львова, якія на „Крэсах“ нашых беларускіх дзетак асьвячаюць на заходня-эўрапэйскі лад?!

Янка Маланка.

З жыцьця Горадні.

× **Прысуд у справе „32“.** 14 траўня ў 12 гадз. дня Горадзенскі Акружны Суд, у склад якога ўваходзілі: Навінскі, Ільін Кашубскі, — вынес прысуд у справе 32 работнікаў, абвінавачаных у прыналежнасьці да камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, якая мела на мэце адарваць Заходдюю Беларусь і далучыць яе да Радавай. Засуджаны: Валынскі, Рэзнёр, Кузняцоў-Курбскі, Ворцэх, Зільбэрбэрг і Езерска—па 3 гады з залічэньнем сьледчага арышту. М. Ламашэвіч, Александровіч, Стрэшка, Елін, Любіч, Антанюк, Крымска і Абрамовіч—па 2 гады з залічэньнем арышту 1 год 7 месяцаў. Кузніцкі, Цыбульскі — па 1 году 6 месяцаў. Н. Самчучанка, Т. Польніцка, Х. Шацка і А. Бравэр — па 1 году. С. Прусак, Я. Барада, Атлас, Гарошка, Шахновіч, Д. Зільбэрштэйн, Кулік і Ул. Паддубік — абнявінены.

Галоўнага сьведку і фабрыкантку гэтага працэсу арыштавалі на судзе за тое, што яна адмовілася ад сваіх паказаньняў, якія давала ў паліцыі і ў сьледчага, кажучы, што ей так сказалі ў паліцыі паказаць, за што атрымала ад паліцыі каля 1.000 злотых.

Молат.

З Т-ва Бел. Школы.

З працы Т-ва на мяйсцох.

У вёсцы **Каўшова**, Горадзенскага павету, драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларускае Школы 25 га красавіка с. г. была пастаўлена п'еса ў 5 актах Янкі Купалы „Раскіданае Гняздо“. П'еса была згуляна вельмі добра, глядзельнікаў было шмат, так што ў адзін вечар ня было магчымасьці зьмясьціць усіх жадаючых, якія прышлі паглядзець на гэту п'есу. Дзеля гэтага гэтая самая п'еса была пастаўлена 26-га красавіка. Увесь чысты даход пайшоў на карысьць бібліатэкі-чытальні, якая істнуе пры гуртку Т-ва.

* * *

У м. **Скідлі**, Горадзенскага пав., драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларускае Школы 8 траўня ў памешканьні мястэчковага тэатру была згуляна п'еса ў 3 актах Ф. Аляхновіча „Страхі Жыцьця“, пасьля чаго дэклямаваліся вершы беларускіх паэтаў. Даход пайшоў на карысьць бібліатэкі-чытальні.

* * *

У вёсцы **Пяшчаніка**, Горадзенскага пав., драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларускае Школы 15 траўня быў зладжаны вечар-спэктакль. Пастаўлены былі 2 камэдыі: „Міхалка“ і „Модны Шляхцюк“. Увесь даход пайшоў на карысьць бібліатэкі-чытальні.

* * *

У вёсцы **Бандары**, Азёрскае гм., Горадзенскага пав., драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларускае Школы 22 траўня быў зладжаны спэктакль. Ставілі камэдыі Л. Родзевіча „Пасланец“ і „Конскі Партрэт“. Увесь чысты даход пайшоў на карысьць бібліатэкі-чытальні, якая істнуе пры Бандарскім Гуртку Таварыства Беларускае Школы.

* * *

У вёсцы **Стральцох**, Горадзенскага пав., драматычнай сэкцыяй Гуртка Т-ва Беларукае Школы на дзень 2 чэрвеня ладзіць вечар-спэктакль. Пастаўлены будуць камэдыі Л. Родзевіча: „Зьбянтэжаны Саўка“ „Пасланец“ і „Конскі партрэт“. Увесь даход мае быць назначаны на карысьць бібліатэкі-чытальні ім. Антона Луцкевіча. якая істнуе пры Стралецкім Гуртку Т-ва Беларускае Школы.

У справе сяброўскіх складак

Горадзенская Акружная Управа зьвяртаецца да Гурткоў свайго вокругу з просьбай аб акуратнай прысылцы належнай часткі складак, адначасна напамінаючы сябрам той абавязак, які яны, дабравольна і ахвотна прынялі па сябе, упісываючыся ў сябры Т-ва. Вы йшлі ў Т-ва з думкай спрыяць роднай асьвеце і ведаючы, што кожны грош, палажаны Вамі на культурную справу, ідзе на будаваньне лепшае сьветлае будучыні; дык памятайце, што бяз грошай Т-ву істнаваць вельмі цяжка, бо яно ня можа зьдзейсьніць тае мэты, якой Вы хочаце дапяць, упісываючыся ў Т-ва. Дзеля гэтага па меры сілаў пастарайцеся акуратна кожны месяц унасіць сваю сяброўскую складку скарбніку, або кіраўніку свайго Гуртка, які ў свой чарод павінен адаслаць палову ў Акружную Управу. Пры акуратным узносе сяброўскіх складак і Гурток можа весьці карысна працу, і Акружная Управа ў кожным разе можа прыйсьці з дапамогай, наладжваючы культурную працу, якая падыйме стан і імя беларускага народу.

Нашае культурнае ўзгадоўваньне ідзе ў напрамку ўсьведамленьня сваіх правоў і абавязкаў. Калі мы цьвёрда зразумеем свае абавязкі, калі ў нас хопіць сілы выканаць іх дэтальна, тагды мы здабудзем найвялікшую перамогу -- перамогу над нясталасьцю, якая псуе ўсе нашыя справы і робіць немагчымым шанаваньне самых сябе. Дзеля гэтага, сябры, калі Вы будзеце акуратна ўнасіць свае складкі, дык ужо зробіце найвялікшы крок у культурным напрамку, і ўсё іншае будзе зьдзейсьніць лягчэй.

Старшыня: **П. Сеўрук.**
Сэкрэтар: **Зьм. Кулакоўскі.**

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

***БРАТЫ!** Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.*

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

Пратэстуем проці адабраньня ў нас роднай беларускай школы.

(М-ка Маркава, Маладэчанскага пав.).

Яшчэ ў 1921 г. мы сваімі ўласнымі сіламі адчынілі сваю родную беларускую школу—4-х аддзяловую. Самі навет пастараліся аб будынак. Бо дом пад школу быў зусім разьбіты. Дык мы ўсе грамадой сабраліся і адбудавалі яго. На вучыцялёў запрасілі п. Вольку Маяйку і п. Міцьку, якія зьяўляюцца вучыцялямі і добра ўсім тут вядомыя. Ад самага пачатку выкладалася ў школе ўсё на беларускай мове і стаяла яна вельмі добра. Проста люба было глядзець, як вучыліся нашы дзеткі ў роднай мове. Але нечаканьне! Калі гэта мужык-хам мог вучыць дзетак сваіх у роднай мове? Дык і тут нічога ня вышла і школу нашу зьліквідавалі. Запарола ў вока пану Страшынскаму, а там і школьнаму інспэктару наша беларуская школа. Звольнілі нашу вучыцельку п. Маяйку, вучыцеля Міцьку некуды перавялі а да нас панасылалі „rdzennych rodaków“ п. п. Белановічаў, Антушкевічаў і іншых. Дык ці-ж магла пры іх выкладацца мужыцкая мова ў школе? Вядома што не. Адабралі ў нас нашу родную беларускую мову са школы і пачалі выкладаць усё папольску, ня гледзячы на тое, што дзеткі нашы і не разумелі, што ім выкладалася. І нічога мы не маглі зрабіць, сказалі пасылаць дзяцей у школу і мусілі пасылаць, а не, дык мусілі-бы плаціць штраф па 10 зл.

Мы сяляне м. Маркава пратэстуем проці таго, што адабралі ў нас нашу родную мову са школы, а да нас далучаюцца і сяляне іншых вакалічных вёсак. Мы дамагаемся вярнуць нам нашу родную школу, якая так добра істнавала ад 21 году і заяўляем, што будзем байкатаваць тую школу, у якой ня будзе ўведзяна беларуская мова.

Пад гэтым пратэстам падпісалася 33 асобы. **Аўтар Алек.**

Войты нашай воласьці.

(Воласьць Беніцкая, павет Маладэчанскі).

Хоць, здаецца, гміна наша ня так вялікая ў абшары і ў насяленьню, а мае аж двух войтаў. Адзін тутэйшы шляхтунок з Цялятак Дзятковіч, а другога Пжэздомскага аднекуль (здаецца з-пад Варшавы) п. староста прыслаў („to nasze samorządy“). Бяруць па 10 зл. у дзень, а калі няма аднаго з войтаў у гміне, то справы не залатвіш хоць-бы і зусім малой. Вось-жа падаю прыклад: жыхар в. Даўгінова В. Баўтрош працаваў пры гміне (рабіў хлеў) і зарабіў 15 зл., якія праз некалькі месяцаў заплацілі. Калі прыдзе сыскаваць грошы, то каторы ёсьць у гміне войт кажа „забраў ключ ад касы той войт і я не магу даць“. І адзін на аднаго складалі, аж пакуль тым войтам добра не надаеў бедны селянін, якому таксама надаела хадзіць.

Мне здаецца, гэта яны так робяць, што трэба грошы даваць, цікава як-бы яны казалі, каб іх пазваў на „шкляны патрон“ (на гарэлку да Аўсяніка)? Пэўна каб абудвых ня было, так адзін яшчэ ляпей пашоў-бы.

Вось якія парадкі ў нашай воласьці і вось нашы самаўрады. **Палькевіч.**

Вялікі начальнік.

(Вялейскі павет).

Наша Войстамская воласьць стала цярпець страшны голад на друкаванае беларускае слова з таго часу, як зьліквідавалі Грамаду. Думалася перш, што гэта ўсюды так ёсьць пасьля ўспомненага выпадку, што беларускія газэты (сапраўдныя беларускія газэты, а ня польскія ў беларускай мове, якімі нас засыпаюць) зусім ня выходзяць болей. Але як мы даведаліся газэты беларускія выходзяць і надалей, але мы толькі іх не атрымоўваем. Пашлі навадзіць спраўкі, каб даведацца, што гэта такое. Аж аказалася, што ў ва ўсім гэтым вінават наш начальнік паштовай агэнцыі ў Войстаме, бо гэты вяльможны пан ня хоча, каб мы чыталі „бальшавіцкіх газэт“, як ён нам казаў, і таму там, ня гледзячы на тое, што мы пасылаем падпісную плату ў „Нашу Праўду“ і інш. газэты і што газэты прыходзяць на нашу паштовую агэнцыю, мы не атрымоўваем, бо пан кіраўнік Войстамскай паштовай агэнцыі ня хоча, каб мы чыталі бальшавіцкія газэты, а калі дамагаемся належачае нам па праву — ён называе нас яшчэ бальшавікамі, ды камуністамі. А „Беларускі Дзень“ дык раздае ўсім, хто хоча і ня хоча і хто колькі хоча, і то дарма Дык вось якая праўда! Мы мусім чытаць тыя газэты, якіх хоча кіраўнік паштовай агэнцыі! а не якіх мы хочам самі. Што думае сабе гэты вяльможны пан, ня ведаю, але мусіць яму за гэта не паздаровіцца, бо мусіць жа быць канец усякаму бяспраўю. **Войстамскі.**

Аб жыцьці м. Гарадка.

(Беластоцкі павет).

Вялікае наша мястэчка Гарадок. Жыхарства яго, за выняткам паліцыянтаў (якіх маем аж 7) чыста беларускае, але разам з тым і беднае надта. Большасьць гаспадароў у Гарадку такіх, у якіх хлеба хапае толькі да Каляд. Прычына гэтага зразумелая — малазямельле. Побач з Гарадком ёсьць шмат яшчэ такіх вёсак, жыхары якіх яшчэ да гэтага часу сядзяць ў сырых зямлянках. Але ня будзем чапаць гэтых апошніх, лепш зьвернем увагу на самы Гарадок. У Гарадку ёсьць аж сем фабрык, у якіх працуюць, за выняткам некалькіх жыдоў, толькі беларусы. Але бяда ў тым, што яны ня цікавяцца зусім работніцкімі арганізацыямі, дзякуючы чаму фабрыканты над імі зьдзекуюцца, як хочуць. Было некалькі такіх работнікаў, што спрачаліся з фабрыкантамі, утрымоўвалі работніцкі саюз і наагул баранілі работніцкія інтарэсы, але дзеля таго, што ня мелі яны падтрыманьня са стараны іншых работнікаў, і пацярпелі, бо цяпер ходзяць бяз ніякай працы, выкурылі іх як „неблаганадзёжных“. А некатарыя з іх яшчэ да сягоньняшняга дня сядзяць па турмах. Апісаць усё тое, што робіцца ў Гарадку, проста немагчыма, але, як падумаеш, дык аж жах бярэ. Калі даўней, як істнаваў работніцкі саюз, на фабрыках працавала 30 чалавек цяпер працуе толькі 8 чалавек. Гэта не жартачкі. А хто гэтаму вінават як ня самі работнікі, тыя 8 чалавек, што робяць сягоньня замест 30? А найгоршыя з іх сабе і другім работнікам ворагі дык гэта 2, якія даносяць аб усім фабрыкантам. Такія роботнікі ёсьць у фабрыцы Рэпекска, Лунскага і Готліба. Мог бы навет падаць тут імя гэтых работнікаў, але можа лепш пачакаць, а можа яны агледзяцца і перастануць рабіць такую шкодную работу для сябе і для сваіх братоў работнікаў іншых, можа адумаюцца яшчэ. Дык раджу вам, шаптуны, перастаць прадаваць работніцкія інтарэсы фабрыкантам за прыязьнь да сябе асабіста фабрыканта; занадта малая цана гэта, ды ў дабавак яшчэ і нятрывалая. Глядзі, што і сам яшчэ апынішся на вуліцы і бяз працы, як толькі страціш ласку ў фабрыканта і тады ня будзе каму жаліцца, ды і заступіцца ня будзе каму, калі не падтрымаюць свае браты работнікі праз работніцкія арганізацыі. Дык апамятуйцеся заблудзіўшыя авечкі!

Работнік.

Рэдактар-Выдавец: С. Татарын.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.